# БУСЬКО Мікалай Іосіфавіч



## Біяграфія

Мікола Бусько нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння Турэцкай сярэдняй школы Карэліцкага раёну ў 1959—1962 гг. служыў у войску. У 1962 годзе скончыў Баранавіцкі тэхнікум лёгкай прамысловасьці, а ў 1967 годзе — выяўленчы факультэт Маскоўскага завочнага народнага ўнівэрсытэту мастацтваў. У 1963—1965 гг. працаваў рабочым на лесагандлёвай базе. У 1965—1967 гг. быў афарміцелем у Доме афіцэраў, у 1967—1976 гг. — на мясакамбінаце, з 1976 году — афарміцель аўтобуснага парка ў Баранавічах.

# Творчасць

Першыя вершы апублікаваў у 1970 годзе ў раённым друку. Сябра Саюзу беларускіх пісьменьнікаў з 1989 году. Вершы друкаваў у часопісах «Полымя», «Беларусь», «Маладосць», газэце «Літаратура і мастацтва», а таксама ў калектыўных зборніках «Дзень паэзіі», «Паэзія Берасцейшчыны” Аўтар кнігі паэзіі «У Нёмна на плячах» (1986). «Ад галінкі да сучка — тэлефон у павучка» (1993), «Сузор’е Шаляў» (1995), «Шасцікрылец Хмарагон» (1997). Цяпер піша і рыхтуе да выдання прозу.












## *МАСТАК*

Сінявокі Нёман
Сапраўды мастак.
Выйдзе з пушчы цёмнай
І малюе так:

Жоўтага пясочку
Спакваля нанёс—
Хай у промнях сонца
Ажывае плёс.
А з пяску сырога
Мо за тыдзень-два
Знойдзе шлях-дарогу
Ранняя трава.

У кашулі новай
Ранак-пастушок
Выгане каровы
Пасвіць на лужок.

Дзецям і дарослым
І ўсяму наўкруг
Даспадобы росны,
Поўны кветак луг.

— Плюх! — пакідаў цені
У вадзіцу-шкло.
Да ракі натхненне,
Нібы госць, прыйшло.

Прыгажосць якая!—
Ліпеня разгар.
Ў небе праплывае
Каравела хмар.







# СУЗОР'Е ЛЕБЕДЗЯ

Фарбы восені бачны ў пазалоце бярозак, у чырвоным полымі рабін, у срэбным убранні асінак. На маладым дубе лісце пачарнела, стала бліскучым, нібы пакрытае лакам.

Раніца прачынаецца ўжо без птушынай песні. Калі павее холадам, вяла зацілікае хіба што сінічка.

Сёння я пакажу ўнуку Арцёмку сузор'е Лебедзя. Яно спрыяе адлётным птушкам у іх нялёгкай дарозе за мора, у цёплыя краіны.

Узгорак, на якім мы стаім, жыве нібыта асобна ад усяго наваколля. Адсюль распаўзаюцца ў розныя бакі сцежкі, над імі шумяць рэдкія сосны. Далей цягнецца пазалочаны вераснем лес. Сарваўшыся з дрэва, над намі пранёсся стракаты дзяцел.

— Уцёк, — уздыхнуў Арцёмка. — Я і разгледзець яго не паспеў.

— Нічога, зараз вернецца, — супакойваю я ўнука.

Падымаю з зямлі сучок і часта стукаю па ствале сасны. Праз хвілін колькі дзяцел прыляцеў, але ўжо не адзін, а са старэйшым сябрам. Чорнымі вугольчыкамі вачэй яны глядзелі на нас спакойна, без страху, падняўшы ўгору дзюбкі.

Мы выйшлі на прасеку.

— Паглядзі, дзед!..

Арцёмка паказаў на страказу, што шклянымі крыльцамі заблыталася ў павуціне, і кінуўся яе вызваляць. Страказа крыху пазумкала, затым запусціла свой рухавічок і, зрабіўшы круг над Арцёмкам, растварылася ў небе.

Лес дыхае прэлым лісцем, мох пахне грыбамі. Хапаючыся за голле, спускаемся са сцежкі бліжэй да рэчкі. Адсюль, знізу, выразна відаць, як сінім светлячком павісла над зямлёй першая зорка.

«Дзінь-дзінь», — падала голас вадзіца. Тонкі струменьчык пратачыў дзірачку ў беразе. Вада круціцца, віруе, пульсуюць пясчынкі ў круглай ямцы. А ў ёй плавае то ўніз галоўкай, то ўверх жывоцікам чорны павучок. Адчайна перабірае лапкамі, стараецца ўхапіцца за што-небудзь трывалае, каб выратавацца.

Арцёмка падаў павучку сцяблінку, і той імгненна выскачыў з вадзяной ямкі і схаваўся ў сухой траве.

Сонца тым часам апусцілася за лес, і мы нацянькі заспяшаліся дамоў. Каля вёскі прыпыніліся, зачараваныя прыгажосцю позняга адвячорка. Над намі шырока, аж на паўнеба, рассцілаўся зорны ручнік Млечнага Шляху. І я дапамог Арцёмку знайсці сузор'е Лебедзя — выцягнуты сілуэт птушкі, якая паказвае нашым крылатым сябрам шлях на поўдзень, у вырай.

